**Стадуб І.Д.**, *дацэнт*

# РЭПРЭСІІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў 20-50-я ГАДЫ

Спадзяванні народаў Расійскай Імперыі на заможнае і бесклапотнае жыццё ў светлай камуністычнай будучыні ў выпадку перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі аказаліся вялікім падманам бальшавікоў. Не паспелі адгрымець апошнія залпы рэвалюцыі, як супраць свайго народа пачаліся масавыя рэпрэсіі. Асабліва масавымі былі яны ў 20-50-я гады. Фізічна знішчаны, пасаджаны ў турмы, высланы ў спецлагеры мільёны ні ў чым не павінных людзей. Да гэтага часу невядомы дакладныя вынікі генацыду дыктатарскага рэжыму супраць свайго народа.

Не абышлі бокам рэпрэсіі і народ Беларусі. Свядома знішчаны сотні тысяч інтэлігентаў, рабочых і сялян. У другой палове 30-х гадоў знішчаны ці вымушаны былі скончыць самагубствам кіраўнікі дзяржавы, прыгавораны пазасудовымі органамі да вышэйшай меры пакарання большасць наркомаў, прафсаюзных і камсамольскіх работнікаў, кіраўнікоў народнай гаспадаркі, якія працавалі ў Беларусі ў 20-я — другой палове 30-х гадоў.

Не шкадавалі каты і членаў адзінай кіруючай партыі. Даволі вялікія страты панесла Кампартыя Беларусі ў сярэдзіне 30-х гадоў. У выніку масавых чыстак і палітычнага тэрору яна страціла 40 працэнтаў свайго складу.

Асабліва жорстка распраўляліся з навуковай і творчай інтэлігенцыяй. Без жалю знішчаліся пісьменнікі, паэты, артысты, мастакі, настаўнікі, выкладчыкі вышэйшай школы. Спецорганы сфабрыкавалі справу «контррэвалюцыйнай» арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», якую быццам бы ўзначальваў прэзідэнт АН БССР У.М.Ігнатоўскі. Даведзены да адчаю, ён скончыў самагубствам у лютым 1931 г. У 1929-1930 гг. органы НКУС расправіліся з яго бліжэйшымі памочнікамі - акадэмікамі М.М.Дурнаво, М.І.Яворскім, віцэ-прэзідэнтам С.Н.Некрашэвічам,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сакратаром В.У.Ластоўскім. У снежні 1930 г. былі пазбаўлены званняў акадэмікаў Г.І.Гарэцкі, А.Д.Дубах, Я.Ю.Лёсік, У.І.Пічэта. 29-31 кастрычніка 1937 г. на ўскраіне Мінска разам са шматлікімі ахвярамі расстралялі яшчэ дзесяць навукоўцаў Акадэміі навук: А.Баліцкага, Я.Бранштэйна, М.Касянкова (М.Зарэцкага), М.Каўцэвіча, М.Кульбака, С.Маргелава, І.Пятровіча (Я.Нёманскага), Р.Пратасеню, Я.Усненскага, І.Харыка.

Усяго рэпрэсіравана 26 акадэмікаў і 6 членаў-карэспандэнтаў. Практычна была разгромлена Акадэмія навук.

Чорная хваля рэпрэсій пракацілася і ў сельскай мясцовасці. Тысячы сем'яў высяляліся ў аддаленыя раёны Сібіры, Казахстана, Сярэдняй Азіі, Комі АССР і іншыя раёны былога Савецкага Саюза. У адпаведнасці з загадам N 44-21 ад 2 лютага 1930 г. Аб'яднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення з БССР планавалася выслаць 6-7 тысяч сем'яў (у той час колькасць членаў сям'і складала ад 4 да 10 і болей чалавек). Месцам высялення для 12 тысяч чалавек вызначалася Сібір.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі хваля рэпрэсій пракацілася і па гэтых раёнах. Добра прадуманая і сплянаваная акцыя была накіравана на знішчэнне лепшых сялян і гаспадарак вёскі. Усю тэрыторыю Заходняй Беларусі падзялілі на 37 зон, у кожную з якіх накіроўваліся аператыўныя тройкі па падрыхтоўцы высялення сялянскіх сем'яў. Для правядзення аперацыі прыцягваліся воіны Беларускай ваеннай акругі і партыйныя органы.

Па звестках, якія маюцца на сённяшні дзень, у Беларусі рэпрэсіравана больш за 350 тысяч сялян.

Многія беларусы і па сённяшні дзень жывуць у месцах высялення. Па звестках нашага земляка Георгія Усцілоўскага, які быў высланы ў Комі ў 1937 г., тут жыве прыкладна 30 тысяч беларусаў. Ён склаў спіс ахвяр-беларусаў, якія засталіся навечна ляжаць у чужой зямлі. У спісе маюцца дзесяткі соцень чалавек. Але ўсе спробы нашага земляка надрукаваць яго ў Беларусі аказаліся марнымі.

Першыя звесткі аб маштабах рэпрэсій з'явіліся ў сярэдзіне 50-х гадоў. У той час была рэабілітавана невялікая колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ахвяр. У перыяд з другой паловы 60-х да сярэдзіны 80-х гадоў гэты працэс значна замарудзіўся і ажывіўся ў час так званай перабудовы.

Пасля смерці Сталіна, у хрушчоўскую адлігу і ў наступныя гады, адпаведныя органы якілгалі, так і працягваюць ілгаць аб некаторых катэгорыях ахвяр. У 1939 г. быў выдадзены загад НКУС, у якім рэкамендавалася на запыты сваякоў аб лёсе таго ці іншага расстралянага адказваць, што ён быў асуджаны на дзесяць гадоў без права перапіскі і перадач. Гэты загад карэкціраваўся ў 1945, 1955, 1963 гг., праіснаваў да канца 80-х і быў адменены толькі ў 1989 г., незадоўга да распаду СССР.

Па сённяшні дзень практычна зачынены дзверы ў архівы КДБ, невядомы маштабы сапраўдных прычын і дат гібелі многіх нашых суайчыннікаў. І, мусіць, невыпадкова. Няма сумнення ў тым, што яшчэ жывуць выканаўцы і сведкі масавых рэпрэсій, носяць на грудзях урадавыя ўзнагароды і карыстаюцца ўсімі дабротамі, якія далі ім былыя ўлады Савецкага Саюза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ